PolotskSU



**УДК [39+008] (=826) (091)**

## ВЯСКОВАЯ ХАТА І ЎРБАНІЗАЦЫЯ

***Я.Ю. Ленсу***
Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Рэспубліка Беларусь
e-mail: lensu50@inbox.ru

*Для народнага ўспрымання рэчаіснасці ў мінулым было характэрна ўяўленне пра неабходнасць сімвалічнага адмежавання абжытай прасторы жытла ад прасторы неабжытага знешняга свету, які нашым продкам уяўляўся недружалюбным, варожым. У XIX ст. у свядомасці суседніх з беларусамі народаў пад уплывам урбанізацыі адбываецца прарыў сімвалічнай мяжы паміж унутранай прасторай жытла і знешнім светам. У Беларусі гэты прарыў назіраецца намнога пазней, што тлумачыцца тым, што тут працэс урбанізацыі, які праходзіў у гарадах, пачаў уплываць на вясковае жыццё намнога пазней, чым у сусудзяў.*
***Ключавыя словы:*** *вясковая хата, прастора жытла, прастора знешняга свету, урбанізацыя, сімвалічная мяжа паміж прасторай жытла і знешнім светам.*

## ДЕРЕВЕНСКАЯ ХАТА И УРБАНИЗАЦИЯ

***Я.Ю. Ленсу***
Белорусская государственная академия искусств, Республика Беларусь
e-mail: lensu50@inbox.ru

*Для народного восприятия действительности в прошлом было характерно представление о необходимости символического отмежевания обжитого пространства жилища от пространства необжитого внешнего мира, который нашим предкам представлялся недружелюбным, враждебным. В XIX в. в сознании соседних с белорусами народов под влиянием урбанизации происходит прорыв символической межи между внутренним пространством жилища и внешним миром. В Беларуси этот прорыв наблюдается намного позже, что объясняется тем, что здесь процесс урбанизации, который происходил в городах, начал влиять на деревенскую жизнь намного позже, чем у соседей.*
***Ключевые слова:*** *деревенская хата, пространство жилища, пространство внешнего мира, урбанизация, символическая межа между пространством жилища и внешним миром.*

## VILLAGE PEASANT HOUSE AND URBANIZATION

***Y. Lensu***
Belarusian State Academy of Arts, Republic of Belarus
e-mail: lensu50@inbox.ru

*In the past people's worldview comprised the idea of the obligatory symbolic separation of the inhabited area of the dwelling from the non-residential place, the world outside, which*

PolotskSU



*seemed unfriendly and hostile to our ancestors. In the 19th century the peoples neighboring Belarusians under the influence of urbanization felt a breakdown of the symbolic border between the internal space of the house and the outer world. In Belarus this happened much later, which is explained by the fact that here the process of urbanization in the cities.*

***Keywords:*** *village peasant house, inhabited area, non-residential place, urbanization, symbolic border between the internal space of the house and the outer world.*

**Уводзіны.** Працэс урбанізацыі, які, пачынаючы з XIX ст. у цывілізаваных краінах актыўна ўплываў на развіццё гарадоў, адбіўся таксама і на пэўных працэсах, якія праходзілі ў сельскай мясцовасці, у вёсцы, у тым ліку на адносінах да вясковай хаты яе жыхароў. У разглядзе гэтага пытання мы сканцэнтруемся на беларускай вясковай хаце і хатах народаў, геаграфічна бліжэйшых да беларускіх земляў. Канкрэтна ж мы спынемся на такім характэрным у мінулым для народнага ўспрымання рэчаіснасці моманце, як ўсведамленне неабходнасці сімвалічнага адмежавання абжытай прасторы жытла ад прасторы неабжытага знешняга свету, які нашым продкам уяўляўся нядружалюбным, варожым.

**Асноўная частка.** Калі ў названым плане звярнуцца да беларускай сялянскай хаты і пэўных момантаў светапогляду яе жыхароў, то можна названае ўсведамленне праілюстраваць наступнымі прыкладамі. У першую чаргу тут можна нагадаць такі старажытны абрад, які выконвалі ў даўніну беларускія сяляне перад пабудовай хаты. На месцы меркаванай будовы на зямлі на ўвесь участак сядзібы чарцілі вялікі квадрат, разбівалі яго крыжападобнай лініяй на чатыры часткі, таксама квадратнай формы, потым прыносілі з чатырох кірункаў свету па каменю і клалі ў сярэдзіну кожнага з малых квадратаў. Чарчэнне селянінам вялікага магічнага квадрата — сімвала апрацаванай чалавекам, а значыць абжытай ім зямлі — на месцы будучай хаты перад яе пабудовай абазначала тое, што жытло беларусамі ў мінулым, як і многімі іншымі старажытнымі народамі, разглядалася як сімвалічна выдзеленая з неабжытага, чужога свету прыроды дружалюбная, спрыяльная чалавеку прастора.

Вось так рытуальна падкрэслівалася азначэнне мяжы будучага дома, якая выдзяляла яго сярод вялікага свету прыроды. Тут трэба дадаць, што калі ўся сядзіба разам з хатай, дваром і гаспадарчымі пабудовамі агароджвалася плотам, то гэты плот, акрамя функцыянальнага прызначэння, меў сімвалічны сэнс, таксама аддзяляючы абжытую прастору жылля ад неабжытай прасторы свету прыроды. Таму нездарма ў беларускіх валачобных песнях і народных казках гаворыцца аб “жалезным тыне”, якім агароджваецца двор [1, с. 39; 2, с. 114] — гэты жалезны, а значыць вельмі моцны, плот павінен быў сімвалізаваць недаступнасць да двара гаспадара ўсялякаму ліху.

Але больш шчыльна і надзейна, чым тын і вароты, аддзялялі чалавека ад знешняй небяспечнай прасторы сцены і дах дома. Як паказвае шэраг беларускіх народных абрадаў і рытуалаў, нашы продкі лічылі, што гэтыя элементы канструкцыі жытла, пэўным чынам асвечаныя, надзейна абараняюць чалавека ад непрыемнасцей, якія яму магло нанесці навакольнае асяроддзе, населенае злымі сіламі і духамі. Менавіта з гэтай мэтай перад тым як засяліцца ў новую хату яе апырсквалі вадою, асвечанай на Вадохрышча. Абароне сцен хаты ад розных небяспечных сіл прысвячаліся таксама разнастайныя спецыяльныя абрады, якія праводзіліся ва ўжо абжытай хаце ў пэўныя рэлігійныя святы. Так, летам, на Зялёную суботу (свята маладой зеляніны)

PolotskSU



спецыяльнымі травамі абкурвалі хату ў абарону ад udaraў маланак. На Тройцу ж усе сцены хаты аздаблялі ссечанымі маладымі дрэўцамі, што павінна было абараніць хату ад бед і паспрыяць шчасцю гаспадароў.

Калі сцены хаты агароджвалі прастору жытла з бакоў, то дах дома з'яўляўся тым рубяжом, які абмяжоўваў жытло зверху, таксама абараняючы яго ад дзеяння небяспечных сіл знешняга свету. Таму-та сяляне так клапаціліся аб надзейнасці страхі. З гэтым былі звязаны і розныя забабоны. Так, лічылі, што саломай ад збожжа, зжатага на дзень Барыса і Глеба (6-га жніўня па новаму, 24-га ліпеня па старому стылю), нельга крыць хату, бо тады страху знясе вецер ці спаліць маланка. Для засцярогі страхі ад непагадзі існавалі і спецыяльныя абрады. Так, на свята Пакрава (14-га па новаму, 1-га кастрычніка па старому стылю) пеклі так званы "святы" пірог, які прыкладалі да страхі хаты і ўсіх гаспадарчых пабудоў, каб моцныя вятры, што пачынаюцца з Пакрава, не разбуралі стрэхі.

Калі сцены і дах як элементы канструкцыі жылля валодалі функцыяй мяжы, якая аддзяляе ўнутраную прастору хаты ад знешняга свету, то вокны і дзверы, наадварот, ажыццяўлялі сувязь жытла са знешнім светам. Таму іх сімвалічная функцыя ў жытле адрознівалася ад сімволікі названых вышэй элементаў канструкцыі жытла. У чым гэта заключалася? Адказ на гэтае пытанне можна атрымаць, прааналізаваўшы беларускія народныя абрады, у якіх удзельнічалі ўваход у дом (дзверы, парог) і вокны.

Пачнём з увахода. Тут характэрным момантам з'яўляецца тое, што пераступанне цераз парог як мяжу паміж прасторай хаты і навакольным светам у беларускіх народных абрадах заўсёды было звязана з асаблівымі рытуальнымі дзеяннямі. Так, у даўніну, калі вярталіся з царквы пасля хрэсьбінаў, немаўлятку бацька клаў на некалькі хвілін на парозе, што звалася асвяціць дзіця цераз парог. Такім чынам адзначаўся ўваход у хату новага члена сям'і. Вялікую сімвалічную ролю адыгрываў парог і ў вясельным рытуале, а таксама ў комплексе абрадаў, што яму папярэднічалі. Так, яшчэ ў час сватання сват, пераступіўшы парог, нізка кланяўся і даваў пахвалёнага, потым жа ў сваёй прамове называў парог "залатым", сваха ж цалавала маці маладой праз парог. Калі ж у дзень вяселля малады прыязджаў у хату нявесты, яе матка са свечкай станавілася на парозе хаты і, падняўшы талерку з хлебам і соллю ўверх, трымала яе да таго часу, пакуль пад ёю цераз парог не праходзілі ўсе прыехаўшыя. Важнасць пераступання цераз парог падкрэслівалася і калі ў час вяселля неслі каравай у хату: пры пераступанні парога скрыпач пераставаў граць, а сват, на момант спыніўшыся на парозе, громка казаў пахваленне богу. Быў таксама звычай жаніху пераносіць нявесту цераз парог у хату на руках. Маладая ж, калі выпраўлялася з роднай хаты, тры разы прысаджвалася на парозе, развітваючыся з ім. У Мінскім жа павеце нявеста павінна была тройчы сесці на парозе хаты жаніха.

Такім чынам, бачым, што парог для беларускага селяніна быў нечым сакральным, яго ў пэўныя адказныя моманты жыцця (хрэсьбіны, вяселле) нельга было абмінуць увагай, прайсці цераз яго без якіх-небудзь рытуальных дзеянняў. Але гэтага мала, парога наогул пабойваліся, лічылі яго месцам небяспечным. Так, гаварылі, што кінутыя на парозе рэчы нельга падымаць, бо яны могуць быць заварожаныя. Таксама расказвалі, што дамавік не любіць, калі ля парога ляжыць які-небудзь прадмет, а тым больш жывая істота — кошка, сабака, — бо гэта перашкаджае яму пераходзіць з хаты ў сені і назад. Думалі таксама, што, калі хворы памірае, то анёл сядзіць каля яго ложа,

PolotskSU



а д’ябл знаходзіцца ля парога, чакаючы, калі божы пасланец адвярнецца і можна будзе схапіць душу нябожчыка.

Чаму ж парог лічыўся такім небяспечным месцам? Ды таму, што цераз яго як рубеж, праз які ажыццяўляюцца зносіны ўнутранай прасторы жылля з небяспечнай прасторай знешняга свету, маглі пранікнуць у дом нядобрыя сілы, якія, па ўяўленнях людзей мінулага, і былі прыналежнасцю гэтага знешняга свету. З гэтым звязана тое, што каля ўвахода ў хату, на парозе рабіліся ўсялякія засцерагальныя абрадавыя дзеянні, якія павінны былі аберагчы жытло ад розных сурокаў. У першую чаргу, трэба адзначыць, што ў беларускіх вёсках раней амаль абавязковым лічылася, каб над дзвярыма, пад столлю, рукою дзяка былі выразаны крыжы. Яны выступалі ў ролі ахоўнага знака, які абараняў уваход у жыллё. Гэткім жа ахоўным знакам з’яўляліся і падковы, якія часта прыбівалі над дзвярамі ці да парога. Вешалі над парогам таксама розныя вострыя прадметы: сярпы, іголкі і інш., — каб не дапусціць у хату “нячыстую сілу”, бо думалі, што аб гэтыя рэчы ведзьма, калі будзе ісці ў дзверы, павінна параніцца. Каб засцерагчы ад вядзьмарак уваход у хату, дзверы таксама часам абкладвалі крапівой, каб нязваная госця ёю апяклася. А вось каб абараніцца ад Мары — жахлівай істоты, што, пранікаючы ў дом, шкодзіла гаспадарам, — клалі на парозе накрыж мятлу і сякеру. Трэба яшчэ сказаць, што на Тройцу (Сёмуху) ля парога хаты ставілі ссечаныя маладыя дрэўцы, што павінна было паспрыяць шчасцю сям’і, аберагчы ад злых духаў.

Засцерагальную ролю мелі таксама дэкаратыўныя элементы аздаблення ўвахода ў хату. Часцей за ўсё яны ўводзіліся ў форму дэталяў металічных запораў і навескі дзвярэй. Так, рабілі ручкі-клямкі са стылізаванымі выявамі галоў коней ці птушак, якія здаўна ў народнай міфалогіі мелі засцерагальнае, спрыяльнае чалавеку значэнне. Рабілі скобы з выявамі вужа, які ў старажытнасці меў сакральную ролю. Асабліва ж пашыраны быў кованы раслінны дэкор, які ў даўніну таксама разглядаўся як засцерагальны.

Сувязь унутранага свету жылля са знешняй прасторай адбывалася таксама праз вокны. Праз акно адкрываўся свет, свяціла сонца ці хмарылася неба, зелянеў сад ці бялелі снягі. Праз акно можна было сімвалічна ўступаць у стасункі з сіламі прыроды, ад якіх залежыла жыццё сялян. Так, у ноч перад Калядамі, калі сям’я садзілася за стол, гаспадар стукаў у вакно, клікаючы мароз есці са ўсімі куццю. Гэтым ён хацеў задобрыць зімовую сцюжу, каб яна не памарозіла пасеянае ў полі і пасаджанае ў агародзе.

Але ў той жа час акно было і слабым месцам хаты як сямейнай крэпасці, таму што магло стаць пунктам пранікнення ўнутр жылля варожых сіл, якія, як лічылі, насяляюць знешні свет. Каб засцерагчыся ад пранікнення ў хату праз вокны гэтых недабразычлівых сіл, людзям патрэбны быў цэлы комплекс спецыяльных сродкаў. Вельмі важнай у гэтым плане з’яўлялася ахоўная дэкаратыўная сімволіка, якая змяшчалася на абрамленні вокан хаты. Засцерагальную, ахоўную функцыю мелі геаметрычныя, раслінныя, зоаморфныя арнаменты на аконных ліштвах. У геаметрычным арнаменце засцерагальную ролю адыгрывалі элементы ў выглядзе ромбаў, якія азначалі зямлю, ралля, хвалістыя лініі, сімвалізаваўшыя нябесную ваду, дождж; у зоаморфным дэкоры — стылізаваныя выявы галоў коней, якія лічыліся сімвалам шчасця, ці птушак, сімвалізаваўшых сямейны дабрабыт; ахоўную функцыю выконвалі і сакральныя салярныя знакі ў выглядзе стылізаваных выяў сонца, шасціпялёсткавых разетак ці шматканцовых зорак.

PolotskSU



Для таго, каб ажыццявіць ахову жытла ад варожых сіл знешняга свету, якія маглі пранікнуць у хату праз акно, існавалі таксама разнастайныя спецыяльныя абрады і магічныя дзеянні. Так, каб засцерагчыся ад вядзьмарак і ведзьмакоў, трэба было абкласці вокны крапівой, бо лічылася, што гэтая пякучая расліна мае сувязь з сонцам і таму валодае ахоўнай сілай. На Духаў жа дзень перад вокнамі хаты ставілі зялёныя бярозкі і галіны іншых дрэў, што таксама павінна было аберагчы жыллё ад нядобрых сіл. Каб абараніць дзіця ад начніц — злых духаў, якія мучаюць дзяцей па начах, не даюць ім спаць, — рабілі спецыяльныя лялькі, якія ставілі на падаконнікі, каб адпудзіць нязваных гасцей, што маглі пранікнуць у хату праз вокны.

Такім чынам, мы бачым, што ва ўсведамленні беларускага народа жыла вельмі сільнае пачуццё неабходнасці сімвалічнага адмежавання прасторы жытла ад прасторы знешняга свету, навакольнай прыроды. Трэба адзначыць, што гэта было ўласціва не толькі беларусам мінулага, але характарызавала наогул архаічны светапогляд народаў, якія засялялі тую ж прыродна-геаграфічную зону, што і беларусы. Але ў беларусаў названае ўяўленне было трывалым і існавала амаль без змяненняў больш доўгі час, чым, скажам, ва ўкраінцаў ці рускіх, на якіх зрабіў уплыў інтэнсіўны працэс урбанізацыі, які пачаўся ў Еўропе ў другой палове XIX стагоддзя. Ва Украіне, напрыклад, у гэты час пад уздзеяннем урбанізацыі адбываецца распад існаваўшага там раней паняцця т. з. “асэлі” — ізаляванай ад знешняга свету прасторы “ад печы да краю сяла”, дзе ўсе складаючыя ствараліся як агульнае прадметнае цэлае [3, с. 20—22]. Чалавек, які імкнуўся тады падпарадкаваць прыроду сваім неўтаймаваным інтарэсам, прарывае сімвалічную мяжу асэлі, у той жа час і прастора жылля адчыняецца павевам жыцця знешняга свету. Гэтае збліжэнне прасторы жылля з навакольным светам ва Украіне праявілася, у прыватнасці, у распаўсюджанні дэкаратыўнага роспісу інтэр’ера хаты (печаў, сценаў, перагародак), што таксама пачалося прыкладна з сярэдзіны XIX стагоддзя. Гэты роспіс уяўляў сабою, хоць у пэўнай ступені стылізаваныя, але шматкаляровыя блізкія да натуры выявы розных прыродных матываў: кветак, дрэваў, лісця, звяроў, птушак і г. д. Такім чынам, навакольная прырода ў выглядзе гэтых выяў як бы свабодна ўваходзіла ў інтэр’ер жытла. Гэта было характэрна не толькі для Украіны. Роспіс унутранасці хаты стаў распаўсюджвацца ў традыцыйным сялянскім жытле і іншых народаў: палякаў, малдаван, рускіх. У Расіі гэта было характэрна асабліва для раёнаў Прыкам’я, Сярэдняга Урала, Сібірскага Заўралля, цэнтральных раёнаў Заходняй Сібіры. Як адзначае расійскі даследчык У. Барадулін, “важнай прадумовай распаўсюджвання роспісу ў XIX ст. стала змена інтэр’ера сялянскага дома, з’яўленне зашклёных вокнаў, гладка абгабляваных сценаў памяшканняў, ацяплення па-беламу, раздзяленне хаты на асобныя пакоі, выдзяленне чыстых горніц” [4, с. 20]. Аднак, акрамя таго, гэта, як мы казалі, быў таксама знак звязанага з працэсам урбанізацыі прарыву сімвалічнай мяжы, якая ў даўніну шчыльна агароджвала свет жылля ад навакольнай прыроды. Прыродныя матывы роспісу, якім цяпер аздабляўся інтэр’ер хаты, як бы перакідвалі сімвалічныя мосцікі паміж прасторай сусвету і ўнутранай прасторай жылля, звязвалі жыллё з прыродным асяроддзем.

Нічога такога не назіралася ў Беларусі. Калі ўзяць афармленне інтэр’ера беларускай сялянскай хаты, то тут у XIX стагоддзі не тое што нельга было сустрэць размаляваную раслінным дэкорам печ ці якую-небудзь перагародку альбо сцену ў хаце, беларускія сяляне нават у штыкі ўспрынялі тое, што некаторыя майстры сталі

PolotskSU



ўпрыгожваць драўляныя куфры, якія стаялі ў хатах, роспісам у выглядзе скрыжаваных кветак ці стылізаваных букетаў. Сяляне адмоўна ставіліся да такіх рэчаў, называючы гэткі роспіс “венікамі”. Воляй-няволяй майстрам прыйшлося адмовіцца ад раслінных матываў у роспісу і звярнуцца да старажытнага геаметрычнага арнаменту з кропачак, зорачак, кружочкаў, крыжыкаў і г. д. [5, с. 113—114]. Гэтыя асаблівыя адносіны беларускіх сялян мінулага стагоддзя да расліннага роспісу ўнутранасці хаты, іх непрыяцце ў ім больш-менш натуралістычных матываў прыроды было несумненна вынікам існаваўшага ў іх трывалага ўяўлення аб неабходнасці надзейнага аддзялення знакавай сутнасці ўнутранай прасторы жылля ад вобразаў знешняга свету. Гэтыя ўяўленні ў беларусаў захоўваліся да самага канца XIX стагоддзя (як бачым, намнога даўжэй, чым у суседніх народаў). Толькі ў пачатку XX стагоддзя ў беларускіх вёсках, калі больш значным тут стаў уплыў урбанізацыі, пачалі прыхільна ставіцца да расліннага роспісу на драўляных куфрах. У некаторых раёнах гэткія рэчы набылі шырокае распаўсюджанне. На Палессі раслінны роспіс нават стаў ужывацца для ўпрыгажэння печаў.

**Заключэнне.** Тое, што ў беларускай вёсцы прарыў мяжы паміж недатыкальнай унутранай прасторай жылля і небяспечнага, як лічылася, навакольнага асяроддзя адбыўся пазней, чым у суседзяў, тлумачыцца наступнымі асаблівасцямі ўкаранення ўрбанізацыі ў Беларусі. Сваю ролю тут адыгралі спецыфічныя сацыяльна-эканамічныя фактары развіцця беларускіх земляў. Працэс урабанізацыі, які адбываўся ў гарадах, на вясковае жыццё тут, у параўнанні з суседзямі, пачаў уплывць дастаткова позна. У беларускай вёсцы да канца XIX стагоддзя панаваў паўнатуральны характар вядзення гаспадаркі, што вызначала ўсё жыццё беларускага селяніна. Гандаль вырабамі мясцовай вытворчасці развіваўся слаба, бо ў тыя часы, калі Беларусь уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, польская шляхта часцей за ўсё грэбавала мясцовымі вырабамі. У выніку ў Беларусі традыцыйна панавала хатняя вытворчасць. Народныя промыслы, прадукцыя якіх ішла на рынак, у Беларусі не набылі шырокага развіцця, толькі некаторыя галіны выступалі як промыслы. У асноўным жа ўсе рэчы – і прылады працы, і адзенне, і бытавое начынне – выраблялiся ў хатніх умовах самімі сялянамі. Паўнатуральнае вядзенне гаспадаркі ўплывала, як мы ужо адзначылі, на ўсё жыццё беларускага селяніна, у тым ліку і на яго светаўспрыманне. У жыхароў беларускіх вясковых хат доўга жылі старажытныя ўяўленні аб адносінах з навакольным светам. У сувязі з гэтым аж да канца XIX стагоддзя ў беларускіх сялян захоўвалася перакананне, што трэба шчыльна ахоўваць сваё жытло ад небяспечнага неабжытага свету прыроды. Толькі ў пачатку XX стагоддзя, калі ўрабнізацыя пачала адбівацца і на беларускім вясковым жыцці, вобразы свету прыроды пачалі пранікаць у прастору сялянскай хаты ў выглядзе каляровых малюнкаў на куфрах, а ў некаторых месцах, як ужо адзначалася, і ў выглядзе роспісу на печах. Такім чынам, менавіта з асаблівасцямі працэсаў урбанізацыі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя былі звязаны змены ў сетапоглядзе беларусаў і суседніх з імі народаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларускія народныя абрады / Склад., навук. рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.
2. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. – Мінск : Вышэйшая школа, 1977. – 839 с.

PolotskSU



3. Лемешев, С. Феномен «осели» / С. Лемешев // Декоративное искусство СССР. – 1987. – № 12. – С. 20—22.
4. Барадулин, В. Роспись крестьянского дома / В. Барадулин // Декоративное искусство СССР. – 1979. – № 3. – С. 20—23.
5. Сахута, Я.М. Фарбы роднай зямлі / Я.М. Сахута. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 191 с.

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании

УДК 72(082)

Редакционная коллегия:
Р. М. Платонова (председатель),
В. В. Васильева (отв. секретарь),
Л. М. Парфенова, Е. Д. Лазовский, В. Е. Овсейчик

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ** [Электронный ресурс] : электрон. сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., Новополоцк, 26–27 нояб. 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: Р. М. Платонова [и др.]. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).

ISBN 978-985-531-734-1.

Представлены итоги исследований, освещающие проблемы истории архитектуры, градостроительства и искусства, современной архитектуры, дизайна и строительства, научно-методические проблемы преподавания архитектурных, дизайнерских и строительных дисциплин.

Предназначен для специалистов в области архитектуры и проектирования, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов архитектурных, дизайнерских и строительных специальностей.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.
Регистрационное свидетельство № 3671815379 от 26.04.2018.*

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 59 95 11, e-mail: r.platonowa@psu.by; u.auseichyk@psu.by

**№ госрегистрации 3671815379.**
**ISBN 978-985-531-734-1** ©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ**
**АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ**
**И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ**

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Технический редактор *А. А. Прадидова.*
Компьютерная верстка *А. А. Прадидовой.*
Компьютерный дизайн обложки *Е. А. Балабуевой.*

---

Подписано к использованию 27.04.2021.
Объем издания: 11,4 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 420.

---

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by